**Маркун Павел**
(г.Астравец)

# КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ НА АСТРАВЕЧЧЫНЕ

Пасляваеннае аднаўленне сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларусі мела свае асаблівасці. Утварэнне першых калгасаў пачалося тут яшчэ да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, пасля ўз'яднання заходніх абласцей Беларусі з БССР. На Астравеччыне калектывізацыя пачалася ў 1940 годзе. Паводле кнігі «Памяць» на 1 верасня 1940-га ў раёне налічвалася ўсяго 5 калгасаў, аднак распачатую калектывізацыю прыпыніла вайна з Германіяй [2, 250].

Пасля вайны калгасы ў заходніх раёнах БССР практычна перасталі існаваць і аднаўляліся марудна, для сельскай мясцовасці асноўнай формай арганізацыі заставаліся аднаасобныя сялянскія гаспадаркі. У першыя пасляваенныя гады савецкая ўлада ў заходніх рэгіёнах БССР была яшчэ недастаткова моцнай і не магла прымусова і хутка далучыць усё сялянства ў калгасы. Да канца 1946 года было адноўлена і арганізавана ўсяго 133 калгасы (0,56 % усіх сялянскіх гаспадарак). Да 1949 года стварэнне калектыўных гаспадарак вялося пераважна шляхам агітацыі на добраахвотнай аснове. Вынікі такой працы аказаліся вельмі нязначныя [3, 11–1].

Масавая калектывізацыя заходніх абласцей БССР пачалася пасля таго, як XIX з'езд КП(б)Б (10—12 лютага 1949 года) прыняў пастанову аб неабходнасці суцэльнай калектывізацыі краіны і завяршэнні калгаснага будаўніцтва ў заходніх абласцях БССР. Вынікам такога рашэння стала правядзенне ў 1949-1951 гадах у заходніх раёнах Беларусі прымусовай калектывізацыі сялянскіх гаспадарак [3, 11–1].

Працэс стварэння сістэмы калектыўных гаспадарак меў на Астравеччыне свае асаблівасці.

На паспяховае правядзенне гэтай кампаніі былі накіраваны вялікія сілы: добра адладжаная прапагандысцкая машына, моцны ўладны прэс і бязлітасны рэпрэсіўны апарат. У студзені 1950 года для ўмацавання калгасаў пры МТС былі створаны палітаддзелы па досведзе ў 1933 годзе, якія «ажыццяўлялі лінію партыі» ў заходніх раёнах. Раённая газета ў кожным нумары паведамляла, што сяляне чарговай вёскі вырашылі працаваць супольна, калектывам, разам будаваць сацыялістычную будучыню. На самой справе адбывалася інакш.

Невыпадкова менавіта ў паслеваенныя гады некаторым калгасным старшыням мясцовыя ўлады давалі зброю – не для пакарання іншадумцаў, а для абароны свайго жыцця. Так, напрыклад, пасля вызвалення тэрыторый Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адбыўся напад на Кемелішкоўскі сельскі савет. Узброеная бандытская групоўка ў колькасці 50 чалавек напала на старшыню сельскага савета таварыша Паляка С.Р. і аператыўнага працаўніка Свірскага РА НКВД, малодшага лейтынанта Савіна. Апошні быў паранены, але разам са старшынёй яны выйшлі з акружэння. Бандыцкай групоўкай былі

знішчаны ўсе дакументы Кемілішкоўскага сельскага савета: спісы па ўліку селішчаў, зямельных надзелаў, жывёлы і іншыя. Нават у канцы пецідзесятых калгаснікі спрабавалі “выліць” усю крыўду і злосць на кіраўніка, вінавацячы яго ва ўсіх сваіх нягодах і пазбаўленнях. Браліся за сякеры і вілы, а самыя агрэсіўныя гатовы былі пайсці на крайнасці – штосці, напрыклад, нацягнутага ўпоперак дарогі сталёвага дроту ўначы на той дарозе, дзе павінен праехаць кіраўнік калгаса [1, 5-6].

Ва ўмовах эпідэмій, войн, рэвалюцый і прыродных катаклізмаў, пажараў – галоўнай праблемай для сялянства з’яўлялася выжыванне. У сувязі з гэтым, наяўнасць індывідуальнай гаспадаркі адыгрывала асабліва важную ролю для выжывання беларускіх калгаснікаў. Дзяржава, яе ўрад, імкнуліся аказваць патрэбную дапамогу наваствораным калектыўным гаспадаркам: накіроўвалі сельскагаспадарчую тэхніку, кваліфікаваныя кадры, спецыялістаў, выдзялялі грашовыя крэдыты. У 1950-ыя стварэнне калектыўных гаспадарак стымулявалася дазволам весці падсобную гаспадарку і спісаннем запазычанасцей. З другога боку, у той самы час, улады ўстанавілі аднаразовы падатак на індывідуальныя гаспадаркі, пры гэтым земляробчыя і рыначныя даходы ўключаліся ў абкладаемы даход. Мяса павінны былі пастаўляць усе аднаасобнікі, нават тыя, хто не меў жывёлаў ды птушак. Незадаволенасць ліквідавалася традыцыйным спосабам – выяўленнем і пакараннем на месцы.

Пад страхам абкладання непасільнымі падаткамі ці раскулачваннем, руплівыя, працавітыя гаспадары павінны былі ісці працаваць у калгас. Горкімі слёзамі пісаліся іх заявы. А з тымі, хто ўпарціўся, з усіх сіл трымаўся за ўласную гаспадарку, асабліва не цацкаліся: сельсавет рабіў абмер зямлі, апісваў жывёлу і хатнюю маёмасць, знаходзіў сведкаў, што гаспадар некалі карыстаўся наёмнай рабочай сілай. Лёс апошняга быў вырашыны: гаспадарка прызнавалася кулацкай. У разлік не бралася, што ў сям’і на дваіх працаздольных прыходзілася трое-пяцёра малалетніх дзяцей і састарэлыя бацькі, і ў пару напружаных палявых работ сям’я проста не магла абыходзіцца без дадатковых рабочых рук.

У 1949-1951 гадах амаль усе вёскі былі калектывізаваны. У занальным дзяржаўным архіве горада Ліда захоўваецца спіс калгасаў, створаных у раёнах ў той складаны час. Паводле гэтага дакумента ў Байканскім сельсавеце дзейнічала 5 калгасаў (163 гаспадаркі і 116 коней), у Гудагайскім сельсавеце – 5 калгасаў (190 гаспадарак і 162 кані), Дзяненёўскім сельсавеце – 4 калгасы (177 гаспадарак і 113 каней), Якентанскім сельсавеце – 7 калгасаў (201 гаспадарка і 176 коней), Шульніцкім сельсавеце – 4 калгасы (131 гаспадарка і 108 коней), Астравецкім сельсавеце – 4 калгасы (174 гаспадаркі і 103 кані), Дравяніцкім сельсавеце – 4 калгасы (92 гаспадаркі і 84 кані), Валейкішскім сельсавеце – 1 калгас з 17 гаспадаркамі і 17 канямі, Быстрыцкім сельсавеце – 4 калгасы (76 гаспадарак і 73 кані), Варонскім сельсавеце – 2 калгасы (48 гаспадарак і 31 конь), Варнянскім сельсавеце – 4 калгасы (130 гаспадарак і 122 кані), Міхалішкоўскім сельсавеце – 3 калгасы (51 гаспадарка і 40 коней), Швяйлянскім сельсавеце – 3 калгасы (79

гаспадарак і 62 кані), Гервяцкім сельсавеце – 7 калгасаў (276 гаспадарак і 205 коней), Рымдзюнскім сельсавеце – 6 калгасаў (214 гаспадарак і 209 коней). Гэты дакумент датаваны 26.12.1949 годам і падпісаны загадчыкам аддзела сельскай гаспадаркі Астравецкага РК КП(б)Б А.Харытонавым [2, 352-253].

У выніку калі ў пачатку 1949 года калектывізацыяй было ахоплена 6,8% сялянскіх гаспадарак, то ў канцы - 39,3%. Фактычна за два гады ў калгасы ўступіла большасць сялян Астравеччыны [3, 11–1].

Да вясны 1951 года аб'яднанне сялян у калгасы было ў асноўным завершана. У гэты час у раёне налічвалася 127 калгасаў і адзін саўгас [2, 354].

Далейшае развіццё калгаснага будаўніцтва ішло шляхам неаднаразовых узбуйненняў і драбленняў. Першае ўзбуйненне адбылося ў 1952 годзе. У мэтах найбольш эфектыўнага прымянення тэхнікі і рацыянальнага вядзення гаспадаркі суседнія калгасы па два і болей аб'ядноўваліся ў адзін і на 01.01.1955 год у раёне налічвалася 52 калгасы і 1 саўгас. Прычына гэтай з'явы вельмі простая – калгасы, арганізаваныя ў межах адной-дзвюх вёсак, былі дробнымі, эканамічна невыгаднымі[2, 354].

Калектывізацыя на Астравеччыне мае свае асабістыя асаблівасці:

1. Фарміраванне калгасных гаспадарак адбывалася ў час сацыяльнай напружанасці і не заўсёды з асабістым жаданнем сялянства Астравецкага краю.
2. Калгасы, арганізаваныя ў межах адной-дзвюх вёсак, былі дробнымі, эканамічна невыгаднымі. Ураджайнасць збожжавых культур складала 5-6 ц/га, бульбы – каля 40 ц/га.
3. У калгасы ўступалі дробныя землеўласнікі альбо ўвогуле бедната. Усе наваствораныя калгасныя калектывы мелі куды меншую колькасць коней, чым колькасць сялянскіх гаспадарак. Асноўныя суадносіны 2/3.

**Спіс выкарыстыных крыніц**:


1. Бондарик, В. Канувшие в лету: колхоз «Красный Октябрь» и его бессменный руководитель Чеслав Рынкевич : В. Бондарик [Островец. р-н] // Островецкая правда. – 2018. – 31 мая. – С. 5-6.
2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Астравецкага р-на. — Мн.: БелЭн, 2004. — 632 с.:
3. Электронное приложение для повышенного уровня к учебному пособию История Беларуси, XIX — начало XXI в. : учеб. пособие для 11-го кл. учреж-дений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / А. В. Касович [и др.] ; под ред. А. В. Касовича, А. П. Соловьянова. — Минск : Изд. центр БГУ, 2021. Режим доступа: http://www.profil.adu.by. — История Беларуси, XIX — начало XXI в. – Дата доступа: 30.09.2025.